Особого внимания заслуживает описание уникальных возможностей СНИТ, реализация которых создает предпосылки для небывалой в истории педагогики интенсификации образовательного процесса, а также создания методик, ориентированных на развитие личности обучаемого. Перечислим эти возможности:

– незамедлительная обратная связь между пользователем и СНИТ;

– компьютерная визуализация учебной информации об объектах или закономерностях процессов, явлений, как реально протекающих, так и "виртуальных";

– архивное хранение достаточно больших объемов информации с возможностью ее передачи, а также легкого доступа и обращения пользователя к центральному банку данных;

– автоматизация процессов вычислительной информационно-поисковой деятельности, а также обработки результатов учебного эксперимента с возможностью многократного повторения фрагмента или самого эксперимента;

– автоматизация процессов информационно-методического обеспечения, организационного управления учебной деятельностью и контроля за результатами усвоения [12].

Таким образом, роль информационных технологий в жизни современного общества носит векторную направленность, СНИТ выступают в качестве средства трансформации повседневной жизни, а посредством коммуникационных сетей социальная жизнь человека перемещается в киберпространство, тем самым усваивая его свойства.

**Список цитированных источников**


1. Заславская, Т.И. Социетальная трансформация российского общества: Деятельностно-структурная концепция. М., 2002.
2. Горбатенко, В.П. Постмодерн і трансформація ціннісної основи людського буття / В.П. Горбатенко // Політичний менеджмент. – 2005. – № 1.
3. Катаев, С. Консервативные и модернизационные компоненты социокультурной трансформации, 2001.
4. Мойсеева, Т.Б. Информационные технологии как средство трансформации повседневной жизни человека: философско-антропологический анализ: диссертация ... кандидата философских наук. Ростов-на-Дону, 2008. – 149 с.
5. Иноземцев, В.Л. Современное постиндустриальное общество: природа, противоречия, перспективы. – М.: Логос, 2000. – С. 57.
6. Козлова, Н.Н. Социально-историческая антропология. – М.: Ключ-С, 1999. – 187 с
7. Шюц, А. Структура повседневного мышления // СоцИс, 1988. – №2. – С. 129-137.
8. Там же.
9. Лелеко, В.Д. Пространство повседневности в европейской культуре. – СПб.: ГУКИ, 2002. – 320 с.
10. Там же.
11. Роберт, И. Современные информационные технологии и дидактические проблемы в образовании: перспективы использования. – Москва: Школа-пресс, 1994.


## ТРАНСФАРМАЦЫЯ РЭЛІГІЙНАЙ СІТУАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ


Адзіночанка В.А.

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, г. Гомель, Беларусь*


Напачатку адзначым, што ў самой назве нашага даклада няяўна прысутнічае хранагічны аспект. Ён абумоўлены імкненнем да канкрэтнасці разважанняў. Рэспубліка Беларусь – маладая дзяржава, працэсы ўзнікнення і фарміравання якой адбываюцца літаральна на нашых вачах. Таму, калі б мы казалі аб трансфарацыі рэлігійнай сітуацыі ў нейкай іншай краіне, напрыклад у Польшчы, то павінны былі б пазначыць хранагічныя межы таго гістарычнага перыяду, які збіраемся аналізаваць. Для РБ гэта не патрэбна, любыя нашыя разважанні маюць характар сучаснасці і актуальнасці.

Мы можам казаць аб сучаснасці ў двух сэнсах. Па-першае, сучаснае – гэта тое, што адбываецца зараз, у дадзены момант, па-другое, – тое, што адпавядае патрабаванням часу, знаходзіцца на іх узроўні. Абодвы гэтыя сэнсы тычацца трансфармацыі рэлігійнай сітуацыі ў нашай краіне. Працэсы, якія ў ёй адбываюцца (не толькі ў рэлігійнай сферы) пачаліся адносна нядаўна, і яны фарміруюцца ў рэчышчы вырашэння тых праблем, якія паўстаюць перад краінай. Праз паняцце *сучаснасць* мы таксама можам пазначыць спецыфіку нашай грамадскай сітуацыі, прычым гэтая спецыфіка мае вельмі канкрэтнае гістарычнае вымярэнне. Рэспубліка Беларусь была абвешчана ў 1991 годзе, і з гэтага часу яна фарміруецца як сістэма палітычных, эканамічных, культурных і, ў тым ліку, рэлігійных кампанентаў.

Скажам таксама аб папярэдніх падзеях, якія далі пачатак працэсам трансфармацы і шмат у чым сфарміравалі сучасны воблік РБ у рэлігійнай сферы. Перш за ўсё трэба ўзгадаць распад Савецкага Саюзу ў выніку перабудовы, якая была пачата па ініцыятыве камуністычнага кіраўніцтва краіны. Падкрэслім, што змены ў рэлігійнай сферы былі аднымі з найбольш яскравых і знешне мелі характар радыкакальнага павароту на сто восемдзесят градусаў. Як вядома, Савецкі Саюз быў атэістычнай дзяржавай. Рэлігія разглядалася ў ім не толькі як "перажытак мінулага", але і як "адзіная легальна існуючая форма антыкамуністычнай ідэалогіі". У выніку перабудоўчых працэсаў яна ператварылася ў "неад'емную частку нацыянальнай культурнай традыцыі" і "аснову маралі". Гэтыя змены адбываліся ва ўсіх былых савецкіх рэспубліках, у тым ліку і ў Беларусі. Але таксама хутка выявілася і спецыфіка, абумоўленая палітычнымі, культурнымі і рэлігійнымі традыцыямі гэтых краін. У Савецкім Саюзе лічылася, што існуе адзіны савецкі народ з адзінай культурай і ментальнасцю. Падзеі 90-х гадоў мінулага стагоддзя прадэманстравалі памылковасць гэтых уяўленняў. Напрыклад, відавочнай зрабілася розніца паміж Прыбалтыйскімі рэспублікамі і краінамі Сярэдняй Азіі, што шмат ў чым было абумоўлена рэлігійнымі традыцыямі гэтых краін. Таксама па-рознаму стала разумецца месца рэлігіі ў грамадстве. Для краін з пераважна мусульманскім насельніцтвам характэрным зрабіліся патрабаванні ўвесці ў грамадскае жыццё рэлігійныя нормы паводзін. Там, дзе пераважае хрысціянская традыцыя, такія патрабаванні выклікаюць энэргічныя пратэсты ў грамадстве, і больш націск робіцца на выкананне прынцыпа свабоды сумлення.

Таксама ўсё больш відавочнай робіцца розніца ў рэлігійнай сферы паміж трыма славянскімі краінымі: Беларуссю, Украінай і Расіяй. Асэнсаванне гэтага з'яўляецца для нас надзвычай актуальным. Асабліва гэта тычыцца розніцы паміж нашай і расійскай рэлігійнай сітуацыяй. Вядома, што ў Расіі пераважае праваслаўная царква, і там разважанні па схеме "рускі – значыць праваслаўны" мае пад сабой гістарычную і культурную глебу. Беларусь жа – традыцыйна поліканфесійная дзяржава. На нашых землях жылі прадстаўнікі самых розных рэлігійных поглядаў. Гэта шмат у чым абумовіла рэлігійную талерантнасць беларусаў, у нас не было значных праследаў а таксама сутыкненняў на рэлігійнай глебе. І зараз на плошчах шмат якіх беларускіх гарадоў побач стаяць праваслаўная царква, каталіцкі касцёл і іўдзейская сінагога.

Таксама нам трэба ўлічваць тую акалічнасць, што пасля распаду Савецкага Саюзу пачалі інтэнсіўна развівацца сувязі Беларусі з еўрапейскімі краінамі. І гэта паслужыла прычынай узмацнення традыцыйна прамежкавага стану нашых земляў паміж Расіяй і Еўропай. У рэлігійнай сферы гэта набыло канкрэтны воблік перш за ўсё ва ўзаемадзеянні ўплываў з боку расійскага праваслаўя і польскага каталіцтва. Але таксама ўзрастае роля пратэстанцкіх арганізацый, цэнтры большасці з якіх знаходзяцца ў ЗША. У гэтых умовах усё больш актуальнай робіцца неабходнасць наладжвання міжканфесійнага дыялогу ў нашай краіне і менавіта на гэтай падставе фарміравання ўстойлівай рэлігійнай сітуацыі.

Мы можам выявіць дзве ўстойлівыя тэндэнцыі, якія назіраюцца ў рэлігійнай сферы Беларусі з канца 80-х гадоў мінулага стагоддзя: фарміраванне станоўчых адносін да рэлігіі і рост колькасці рэлігійных арганізацый. Але гэтыя працэсы патрабуюць, на наш погляд, пільнага аналізу, каб выявіць іх спецыфіку.

Як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, рэлігійнасць жыхароў Беларусі мае пераважна дэкларатыўны характар: веруючымі называюць сябе прыкладна 50% насельніцтва, у той час рэгулярна наведваюць храмы і выконваюць прадпісанні сваёй рэлігіі не больш 7% насельніцтва. Аднак модным зрабілася дэманстраваць сваю рэлігійнасць. Асабліва распаўсюджанай гэтая мода была ў 90-я гады мінулага стагоддзя, калі на хвалі перабудовы імкнуліся адмовіцца ад усяго савецкага і звярнуцца да іншых каштоўнасцей. У рэлігійнай сферы зараз пануе неакрэсленая духоўнасць, лічыцца, што трэба ў нешта верыць. Большасць беларусаў атаясамлівае сябе з праваслаўем, але размова ў дадзеным выпадку ідзе не аб рэлігійнай, а аб культурнай ідэнтыфікацыі – чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да акрэсленай традыцыі. За гады Савецкай улады ў большасці людзей было страчана само разуменне таго, што такое рэлігія. Яна зводзілася, па-першае, да выканання традыцыйных абрадаў (як прыклад: амаль 100% насельніцтва Беларусі і пры камуністах святкавала Пасху) і, па-другое, да сродку суцяшэння чалавека ў яго бедах. Вельмі часта рэакцыяй людзей на змены пачатку 90-х гадоў, якія разбурылі звыклы лад іх жыцця, быў зварот да рэлігіі.

Для ілюстрацыі сучаснай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі прывядзем статыстычныя дадзеныя па колькасці зарэгістраваных рэлігійных суполак на 1 студзеня 2012 г.:

| **Найменне канфесіі** | **Усяго па рэспубліцы** |
|---|---|
| Праваслаўная царква | 1567 |
| Стараверская царква | 33 |
| Рымска-каталіцкая царква | 479 |
| Каталікі лацінскага абраду | 1 |
| Грэка-каталіцкая царква | 15 |
| Рэфармацкая царква | 1 |
| Лютэранская царква | 27 |
| Евангельскія хрысціяне-баптысты | 286 |
| Армянская апостальская царква | 1 |
| Іаганская царква | 1 |
| Новаапостальская царква | 21 |
| Прэсвітэрыянская царква | 1 |
| Хрысціяне веры евангельскай | 512 |
| Хрысціяне поўнага Евангелля | 55 |
| Хрысціяне веры апостальскай | 10 |
| Царква Хрыстова | 5 |
| Месіянскія суполкі | 2 |
| Адвентысты сёмага дня | 73 |
| Сведкі Іеговы | 27 |
| Мармоны | 4 |
| Іудзейская рэлігія | 36 |
| Прагрэсіўны іудаізм | 17 |
| Мусульманская рэлігія | 25 |
| Бахаі | 5 |
| Крышнаіты | 6 |
| **Усяго** | **3210** |

Але гэтыя дадзеныя не адлюстроўваюць цалкам рэлігійную сітуацыю ў краіне. Пытанне аб колькасці прыхільнікаў той ці іншай канфесіі на Беларусі з'яўляецца даволі спрэчным. Афіцыйна лічыцца, што прыкладна 50% насельніцтва краіны – веруючыя, з іх прыкладна 80% – праваслаўныя, 10% – каталікі і 2% – пратэстанты. Розніца паміж працэнтам прыхільнікаў пратэстанцтва і колькасцю зарэгістраваных суполак тлумачыцца тым, што апошнія, быццам бы, вельмі маленькія. На наш погляд, тут ідзе супастаўленне розных паказчыкаў. Бо падлік ідзе на падставе самавызначэння чалавека, таго, да якой веры ён сам сябе адносіць. У праваслаўі і пратэстанцтве гэтае аднясенне мае розны сэнс. Як правіла, аднясенне да праваслаўя мае характер не рэлігійнай, але культурнай ідэнтыфікацыі. Чалавек адносіць сябе да праваслаўнай царквы таму, што ў дзяцінстве быў у ёй хрышчоны, альбо ў сілу ўяўленняў, што праваслаўе – "усходнеславянская рэлігія". Калі ж чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да пратэстанцтва, у гэта укладваецца зусім іншы сэнс. Як правіла, гэта азначае, што ён рэгулярна наведвае суполку, прымае ўдзел у яе жыцці, вывучае Біблію і суадносіць яе палажэнні са сваім жыццём. Таму, на наш погляд, трэба праводзіць далейшыя даследаванні для аналізу рэальнай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі.

Як паказалі сацыялагічныя даследаванні, прыкладна палова насельніцтва верыць ў варажбу, сурокі і г.д., прычым ў гэта ж верыць і больш паловы людзей, якія лічаць сябе веруючымі. Цікава, што ў гэтыя і падобныя ім рэчы верыць і значная частка людзей, якія лічаць сябе няверуючымі. Такім чынам, на нашую думку, светапогляд і паводзіны большасці насельніцтва Беларусі трэба акрэсліць словам не "рэлігія", але "забабоны". Такім чынам, рэгулюючую функцыю на Беларусі зараз выконваюць не столькі хрысціянскія ці іншыя рэлігійныя арганізацыі са сваім веравучэннем, але стыхійная рэлігійнасць, якая вырастае са штодзённага жыцця людзей. Да гэтага дадаюцца рэшткі вельмі моцнай язычніцкай традыцыі, якая спрадвеку існавала на Беларусі. Напрыклад, значная частка насельніцтва зараз святкуе праваслаўную Радуніцу. Але па тым, як гэта робіцца, можна зрабіць вывад, што гэта – былыя Вясеннія Дзяды. Людзі ідуць на могілкі, ядуць там і п'юць і частку ежы і літва пакідаюць на магілах. Гэта чыста язычніцкі звычай кармлення "дзядоў". Яго рэлігійны сэнс большасць людзей зараз не асэнсоўвае, гэта ўспрымаецца як традыцыя. Але, безумоўна, што такія дзеянні знаходзяцца па-за межамі хрысціянства.

Калі казаць пра беларускае заканадаўства, якое тычыцца рэлігійнай сферы, то яго спецыфіка, на наш погляд, у канцэнтраваным выглядзе выражана у Прэамбуле прынятай у 2002 г. новай рэдакцыі закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях", дзе напісана: "Гэты Закон... вызначае прававыя асновы стварэння і дзейнасці рэлігійных арганізацый, выходзячы з: права кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, а таксама на роўнасць перад законам незалежна ад стаўлення да рэлігіі; роўнасці рэлігій перад законам; прызнання вызначальнай ролі Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа; духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі Каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі; неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангеліцка-лютэранскай царквы, іудаізму і ісламу; неабходнасці садзеяння дасягненню ўзаемнага разумення, цярпімасці і павагі рэлігійных пачуццяў грамадзян у пытаннях свабоды сумлення і веравызнання" [1, с. 4].

Трэба таксама адзначыць, што хаця рэлігійная сітуацыя ў сучаснай Беларусі мае свае праблемы, але ў цэлым для яе характэрна мірнае суіснаванне прадстаўнікоў розных канфесій, а таксама наяўнасць міжрэлігійнага дыялогу. Яго асноўным ініцыятарам з'яўляецца праваслаўная царква. На ўзроўні рэспубліканскага кіраўніцтва наладжаны вельмі добрыя ўзаемаадносіны паміж праваслаўнымі і каталікамі, ідзе ўзаемадзеянне з евангельскімі хрысціянамі-баптыстамі, праведзены вельмі прадстаўнічыя канферэн-

цыі па пытаннях дыялогу з мусульманамі і іудзеямі. Па ініцыятыве Беларускай Праваслаўнай царквы ў апошнія гады прайшлі тры вельмі прадстаўнічыя канферэнцыі, прысвечаныя пытанням міжканфесійнага дыялогу: "Дыялог хрысціянства і ісламу ва ўмовах глабалізацыі" (2007 г.), "Хрысціянска-іўдзейскі дыялог: рэлігійныя каштоўнасці як аснова ўзаемапавагі ў грамадзянскай супольнасці" (2009 г.), "Праваслаўна-каталіцкі дыялог: хрысціянскія этычныя каштоўнасці як унёсак у сацыяльнае жыццё" (2011 г.).

Гаворачы аб тэндэнцыях развіцця рэлігійнай сітуацыі ў нашай краіне, трэба адзначыць, *што тыя канцэпцыі XIX ст., у якіх сцвярджалася непазбежнасць знікнення ў будучым рэлігіі*, не пацвердзіліся. Гэта тычыцца як марксісцкай ідэі аб тым, што па меры паляпшэння жыцця асноўнай масы насельніцтва і рэальным вырашэнні існуючых праблем знікне неабходнасць у ілюзорным суцяшэнні, якое дае рэлігія, так і канцэпцыі А. Конта, які вылучаў у гісторыі чалавецтва тры стадыі: рэлігійную, метафізічную і навуковую і звязваў адміранне рэлігіі з паступовым развіццём чалавечых ведаў. Уплыў рэлігіі ў еўрапейскай культуры і зараз застаецца даволі вялікім, але паступова зніжаецца колькасць людзей, якія прымаюць удзел у рэлігійным жыцці. Вельмі высокі ўзровень рэлігійнасці ў суседняй з намі Польшчы – 95% насельніцтва лічаць сябе католікамі. Традыцыйна рэлігійнай з'яўляецца самая заможная краіна свету – ЗША. У Беларусі таксама назіраецца відавочная тэндэнцыя павялічэння ўплыву рэлігіі.

Зараз у Еўропе ўсё большую папулярнасць набывае канцэпцыя постсекулярнага грамадства, якая прадугледжвае адмаўленне ад супрацьпастаўлення рэлігіі іншым сферам жыцця і наладжванне дыялогу паміж імі. Прызнаецца, что што ідэя аб непасрэднай сувязі паміж прагрэсам і адмаўленнем ад рэлігіі не падцьвердзілася. Але для нашай сітуацыі больш адэкватна казаць не аб постсекулярным, але аб постатэістычным грамадстве. Тая сітуацыя ў рэлігійнай сферы, якая зараз існуе у Беларусі, з'яўляецца спадчынай не працэса секулярызацыі, але жорсткай атэістычнай палітыкі.

На наш погляд, трансфармацыя рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі будзе абумоўлена перад усім унутрырэлігійнымі прычынамі. Бо кожная рэлігія ўяўляе сабой сістэмнае ўтварэнне, якое мае сваю логіку развіцця і ў залежнасці ад яе займае адпаведнае месца ў грамадстве. Зараз на Беларусі паступова адбываецца ўзмацненне талерантнасці, а таксама развіццё міжрэлігійнага і міжканфесійнага дыялогу. Менавіта ў працэсе гэтага дыялогу і павінна сфарміравацца якасна спецыфічная рэлігійная сітуацыя ў Беларусі, якая б адпавядала гістарычнай традыцыі, а таксама сучаснаму стану і тэндэнцыям развіцця нашай краіны.

**Список цитированных источников**

1. О свободе совести и религиозных организациях: Закон Республики Беларусь // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 6 нояб. 2002 г. – № 123. – С. 4-15.

## СОВРЕМЕННАЯ МОТИВАЦИЯ РЕЛИГИОЗНОЙ ВЕРЫ

Предко Т.И.
*Брестский госуниверситет им. А.С. Пушкина, г. Брест, Беларусь*

Системная трансформация белорусского общества привела к существенному изменению мотивации поведения и деятельности наших граждан, в том числе верующих людей. Одним из наиболее важных показателей этих изменений являются ценностные ориентации, благодаря которым верующие отграничивают лично значимое от несущественного. В их сознании социальные вопросы преломляются через призму религиозного миропонимания. В свою очередь, богословы и профессиональные служители культа предлагают мирянам ценностные ориентации на трансцендентное,